і прыгожым. Будзем тварыць яго дарагім нам. Будзем адухаўляць яго дыханьнем нашага жыцьця. І ўвойдзем мы ў новы этап моцнымі, дасьведчанымі. І наша любоў, дружба і каханьне ўзрасьце яшчэ вышэй і заквітнее яшчэ прыгажэй на зло ўсім нашым недругам і злыдням.

Так ось, любыя мае, як уяўляецца мне наша выгнаньніцкая пяцігодка. Праўда, пакуль што, як бачыш, яна вельмі схематычная. Але з часам будзем яе папраўляць і напаўняць жывым зьместам свайго жыцьця.

У наступных лістох, а пісаць буду цяпер часта, пастараюся разьвіць гэта ўсё больш падрабязна. Цяпер яшчэ адно. Ты, пэўна, спытаеш, а як–жа з рэчамі. Дык от, любая, іх лепей за ўсё будзе пераслаць багажом. Ды й то толькі самае патрабнейшае, як паліто, гарнітур, коўдру і, бадай, пакуль што ўсё. Чым меней рэчаў, тым лепш. Але пра гэта я шчэ напішу ў другім лісьце.

Дык ось, любая мая, надумай і рашай сама наконт паездкі. Маю думку цяпер ты ведаеш. Лорачка і Лялячка будуць таксама за мяне. Праўда, малышыкі? Не пускайце мамы ад сябе, калі яна не дастане дармовага праезду. А то ой як саскучыце без яе! Угаворвайце яе, каб яна пашукала сабе работу ў Маскве ці Ленінградзе.

Любыя мае, як–жа вы гуляеце ў бабулі? Ці добра Вам там? А з Лёняй і Толікам ня сварыцеся? Яны ўжо, мусіць, вялікія хлопчыкі. Ці зьнімаліся яны? Калі ёсьць картачкі, дык прышлеце і мне. А ці зьнімаліся вы з мамаю і з бабуляю? Таксама прышлеце карткі. Вы ўжо, мусіць, такія вялі[кі]я, што тата вас і не пазнае. Расьцеце, любыя мае, гуляйце. І тата душою заўсёды з вамі будзе.

Прывет Вам усім. Вітань[не] Ігнасю з Ленай і маме. Моцна–моцна цалую вас, любыя мае.

Ваш *Адам*.

## № 48. Ганьне Бабарэцы

*21.VII.1931*

301 Слободского 664.10.21.12
Минск Гарбарная 18, Бабарека
Приехал Слободской Свободен
Ожидай письма Адам

## № 49. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*22/VII–31 г., Слободской.*

Любая, дарагая мая Анечка!

Вось я й на месьці. Учора даў табе тэлеграму ў Менск і Ігнату ў вёску з дапіскаю: чакайце ліста. І вось як вам падабаецца: сёньня схадзіў гэты горад і нідзе няма паперы і канвэртаў. Нібыта вось ты папаў у край, дзе адмірае карэспандэнцыя. Але гэта справа паправімая. Прыдзецца заняцца саматужнай вытворчасьцю гэтых рэчаў. Сырцу ж у выглядзе сшыткаў яшчэ можна дастаць. Уражаньні, наогул, яшчэ раскіданы, а таму ня дзівіся раскіданасьці гэтай і лістоўкі. Сам гарадок гэты ніштаваты з агульнага выгляду. Я б сказаў, гэта дачны гарадок, запушчаны, страх, крапіва, крапіва паабапал тратуараў амаль ні ўрост чалавека, а вуліцы зялёныя, от усё роўна што дываном